Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Барысаве аштрафавалі футбольных фанатаў

13.10.2015 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



На трыбунах "Барысаў-арэны". Фота www.pressball.by

Разгляд адміністрацыйных спраў затрыманых пад час футбольнага матча адборачнага турніру Чэмпіяната Еўропы па футболе Беларусь — Македонія **Зміцера Хведарука, Віталя Будзько і Юрыя Пархоменкі** пачаўся ў судзе Барысаўскага раёна ў 16-00. Справы разглядае суддзя **А. Болатаў.** Затрыманыя дастаўленыя ў суд.

Затрыманне адбылося пасля заканчэння першага тайму гульні. Да заўзятараў падыйшлі супрацоўнікі міліцыі й папрасілі прыбраць з вопраткі бела-чырвоныя шалікі з выявай герба Пагоня. Гэта выклікала ў аматараў футболу адпаведную рэакцыю: яны запатрабавалі патлумачыць якія нормы закону парушаюцца нашэннем шалікаў. У адказ ім было прапанавана выканаць просьбу міліцыі, каб “пазбегнуць праблемаў і даглядзець матч да канца”. Моўная спрэчка скончылася гвалтоўным затрыманнем хлопцаў.

У Барысаўскім РУУС у адносінах да кожнага затрыманага былі складзены ідэнтычныя па зместу пратаколы аб адміністратыўным правапарушэнні артыкулаў КаАП 17. 1 (дробнае хуліганства), 23. 4 (непадпарадкаванне законным патрабаванням супрацоўнікаў міліцыі). Па словах міліцыянтаў парушэнне грамадзкага парадку выявілася ў брыдкаслоўі й адмове рэагаваць на заўвагі супрацоўнікаў сілавых структураў. Таксама міліцыянты казалі ў судзе аб тым, што заўзятары аказалі супраціў пры затрыманні: “упіраліся нагамі”, “махалі рукамі”, “садзіліся”, “падымалі ногі, каб іх неслі”.


На баку абвінавачання ў якасьці сведкаў па ўсіх трох справах выступілі два байцы аддзялення АМАП УУС Мінаблвыканкаму. Інтарэсы затрыманых прадстаўляла адвакатка. На карысць заўзятараў давалі свае паказанні два сведкі, прысутных падчас футбольнага матчу.

Суд, які пачаўся а 16 гадзіне, скончыўся позна ўвечары, а 20. 30. У выніку ўсіх трох пакаралі штрафам у памеры 10 базавых велічынь: па 3 базавых за “мат” і 7 базавых за “непадпарадкаванне”.


Праваабаронца з Барысава **Алег Мацкевіч** адзначае, што “ў Беларусі выкарыстаньне артыкулаў КаАП супрацоўнікамі міліцыі з мэтай ціску на палітычна актыўных грамадзянаў, футбольных фанатаў і нефармальных лідэраў мае масавы характар ужо доўгі час. Нагэтулькі доўгі, што аб гэтым ведаюць нават за межамі краіны. Напрыклад, у КПЧ ААН, куды неаднойчы звярталіся беларусы, незаконна прыцягнутыя да адміністратыўнай адказнасці за свае погляды”.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА


"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"









АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ

‹ ›



Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY